УДК 811.161.3'374.81

# Рэлігійная лексіка сучаснай беларускай літаратурнай мовы: функцыянальны аспект

Будзько І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Слоўнікавы склад мовы – надзвычай дынамічная сістэма, якая змяняецца часта пад уплывам экстралінгвістычных фактараў: сацыяльных, культурных, эканамічных і г.д. Не апошнюю ролю на стан і дынаміку развіцця мовы (у дадзеным выпадку беларускай) адыгрывае канфесійны фактар. Паколькі асноўныя лексікаграфічныя крыніцы беларускай мовы ХХ стагоддзя ствараліся яшчэ ў савецкі перыяд, лексіка рэлігійнага характару прадстаўлена ў іх у невялікім аб’ёме. Таму надзвычай актуальным з’яўляецца аналіз спецыфікі функцыянавання лексем з сакральнай семантыкай у беларускамоўным кантынууме. Выбарка рэлігійнай лексікі (асабовых намінацый) для дадзенага паведамлення ажыццяўлялася з перакладаў Пяцікніжжа ХХ ст. на беларускую мову наступных аўтараў: В.Сёмуха: *Быццё, Выхад, Лявіт, Лічбы, Другазаконне* (1995-2002); У.Чарняўскі: *Быццё, Выхад, Лявіт, Лічбы, Другазаконне* (2012); Я.Станкевіч: *Быццё, Выхад, Лявіт, Лічбы, Другазаконне* (1973). Выкарыстоўваліся таксама і пераказы Свяшчэннага пісання для дзяцей: М.Клімковіч, М.Шайбак: *Быццё* (1995); Л.Качанка: *Быццё, Выхад, Лявіт, Лічбы, Другазаконне* (2000).

Напрыклад, у беларускім перакладзе ксяндза Уладзіслава Чарняўскага выразна прасочваецца польская тэксталагічная аснова. Сярод тэонімаў сустракаюцца *Бог, божы (падобнасць божая, вобраз божы), Госпад Бог, госпадаў (дарога Госпадава), Госпад, Дух Божы, Бог Усявышні, Бог Усемагутны, Творца, Госпад Бог вечны, Бог неба, Бог зямлі, Бог міласцівы.* Лексема *бог* ужываецца ў тэксце і ў форме *pluralia богі* для намінацыі варварскіх багоў (*богі чужыя*). Сярод адмоўных намінацый фіксуецца лексема *зьмей*. Іншыя чыны нябеснай іерархіі названы словамі *анёл, хэрубім, Дух Божы, душа*.

Такім чынам, з пяці прааналізаваных перакладаў і пераказаў Пяцікніжжа Маісея толькі пераклад Адама Станкевіча можна лічыць адметным і інавацыйным па выкарыстанні і ўжыванні рэлігійных тэрмінаў. Астатнія чатыры тэксты, нягледзячы на розную тэксталагічную базу, рэпрэзентуюць практычна аднастайны спектр рэлігійных намінацый.